# ЯШЧЭ НЕ ВОСЕНЬ…

**ВАЎКАВЫСКІ РАЁН. 5 кастрычніка ў Доме культуры аграгарадка Вярэйкі адбылася літаратурна-музычная гасцёўня «Жывіце ў радасці», прысвечаная Дню пажылых людзей. У канцэртнай праграме прыняў удзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч.**



Пакаленне ветэранаў працы прынята называць людзьмі залатога ўзросту. Золата нараджае асацыяцыі з багаццем жыццёвага вопыту сталага чалавека, з духоўным хараством яго ўнутранага свету, а таксама з колерам лістапада, у які восень афарбоўвае кастрычніцкую прыроду. Акрамя таго, яшчэ класікамі паэзіі восень названая маркотнай, сумнай парой, часам года, які папярэднічае зімоваму перыяду халоднага бязмоўя, калі прырода замірае. Таму арганізатары мерапрыемства, прысвечанага людзям залатога ўзросту, пастараліся зрабіць яго максімальна пазітыўным. А рамантычны, узнёслы настрой падарыла прысутным выступленне паэта-земляка.

На мерапрыемстве ва ўтульнай зале Вярэйкаўскага дома культуры сабраліся пераважна ветэраны працы, педагогі, культработнікі, аграрыі, работнікі сацыяльнай сферы. У аўтарскім прачытанні Віктара Георгіевіча Курловіча прагучалі творы грамадзянскай, філасофскай і любоўнай лірыкі («Няма настаўнікаў былых» – даніна павагі сваёй прафесіі і нядаўняму прафесійнаму святу; «Яшчэ не восень» – аптымістычны гімн жыццялюбства і шмат іншых твораў лірыкі на роднай, беларускай мове), у ідэйнай аснове якіх – любоў. Любоў да жыцця, да Радзімы, любоў да бліжняга – усё гэта першаасновы паэтычнай творчасці члена СПБ, паэта Віктара Курловіча. Кастрычніцкае выступленне перад землякамі яшчэ раз пацвердзіла непахісную вернасць аўтара сваім ідэалам. У творчасці і ў жыцці. Калі ў душы творцы цеплыня, калі ён адчувае сваю запатрабаванасць, няма прычын сумаваць. Здароўя Вам, дарагі Віктар

Георгіевіч! Няхай апетая вамі восень ніколі не ведае засмучэння і апатыі, а толькі радуе, натхняе на творчасць і радасць жыцця.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

На здымках: сярод удзельнікаў літаратурна-музычнай гасцёўні з красамоўнай назвай «Жывіце ў радасці» – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч. Аграгарадок Вярэйкі, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць. Кастрычнік 2025 года.



